НЯХАЙ ЖЫВЕ ЛЕНІНСКІ КАМСАМОЛ — ПЕРАДАВЫ АТРАД МАЛАДЫХ БУДАЎНІКОЎ КАМУНІЗМУ!
*(З Заклікаў ЦК КПСС да 56-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі).*

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 30 (1028) ● ЧАЦВЕР, 1 лістапада 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выдаецца з 1935 г.



Пад гукі марша праходзяць на сцэну знаменосцы. Стоячы, сустракае іх зала.

## XXV КАМСАМОЛЬСКАЯ

**Мнагалюдна ў галоўным корпусе універсітэта. Навокал — святочна апранутыя хлопцы і дзяўчаты з камсамольскімі значкамі. Гаманлівыя натоўпы збіраюцца ля выставкі насценных газет факультэтаў. Сёння пачынаецца XXV справаздачна - выбарная камсамольская канферэнцыя.**

**Дванаццаць гадзін. На сцэну падымаецца прэзідыум. Сярод ганаровых гасцей — сакратар ЦК ЛКСМБ К. М. Платонаў, сакратар АК ЛКСМБ С. Ф. Сіманькова, сакратар ГК ЛКСМБ Н. А. Кушнерава, сакратар РК ЛКСМБ У. А. Наумчык, рэктар універсітэта У. М. Сікорскі, сакратар парткома Т. Я. Дударава, дэканы факультэтаў, прадстаўнікі камсамольскага актыву.**

**Гучыць марш. Сёння права ўнесці сцягі камсамольскай арганізацыі БДУ прадастаўлена выдатнікам вучобы, лепшым актывістам: Уладзіміру Субату — студэнту IV курса факультэта журналістыкі і Дзмітрыю Аўраменку — студэнту III курса геафака.**

**На канферэнцыю выбрана 637 дэлегатаў. Сярод іх 68 членаў і кандыдатаў у члены КПСС.**

**Гісторыкі дэлегавалі ўдзельніка рэспубліканскага злёту студэнтаў Г. Мурашкіну, юрысты — групкамсорга Г. Ратнікаву. Дзяўчаты ўпершыню ўдзельнічаюць у такім камсамольскім форуме, таму вельмі хвалююцца. З гонарам за свае факультэцкія СБА прыйшлі сюды У. Гайсёнак з фізфака, М. Комлеў — матэматык, член студэнцкага савета інтэрната. Летам ён быў байцом будаўнічага атрада «Эўрыка-73», і шчаслівы, што і яго праца была карысцай.**

**І ў справаздачным дакладзе сакратара камітэта камсамола А. Слукі, і ў выступленнях Р. Саматы, У. Лукашэвіча, У. Ажэгава, М. Зыля, У. Анціміка і іншых, хто прыняў удзел у спрэчках, размова ішла аб удасканаленні стылю і метадаў работы камсамольскай арганізацыі, умацаванні ўнутрысаюзнай дысцыпліны, паляпшэнні вучобы і навуковай работы, павышэнні адказнасці кожнага маладога чалавека за асабісты ўклад у ажыццяўленне задач дзевятай пяцігодкі.**

**З прывітальным словам выступіў сакратар ЦК ЛКСМБ К. М. Платонаў.**

**Словае мае рэктар універсітэта, прафесар У. М. Сікорскі. Ён гаворыць, што галоўная задача XXV канферэнцыі — падвесці вынікі работы камсамольскай арганізацыі, крытычна падысці да недахопаў, намеціць шляхі далейшага ўдасканалення яе дзейнасці.**

**Канферэнцыя выбірае новы састаў камітэта камсамола, штаба «КП», дэлегатаў на XXV раённую камсамольскую канферэнцыю.**

*Матэрыялы з XXV справаздачна-выбарнай камсамольскай канферэнцыі універсітэта чытайце на другой і трэцяй старонках.*

## СВЯТКУЕ МОЛАДЗЬ

«Камсамол — надзея партыі і народа» — пад такім лозунгам праходзіла на філалагічным факультэце свята, прысвечанае 55-й гадавіне з дня нараджэння камсамола. Па традыцыі ў гэты вечар першакурснікі прымалі эстафету ад старэйшых таварышаў, давалі клятву працягваць іх справы.

Разам з выкладчыкамі і студэнтамі ва ўрачыстасці прынялі ўдзел прадстаўнік абласнога штаба СБА Анатоль Бабчынскі, першы сакратар Чэрвеньскага райкома камсамола Людміла Пікулік, студэнты політэхнічнага інстытута.

З вялікай цікавасцю слухалі прысутныя выступленні прадстаўнікоў трох будаўнічых атрадаў, якія рапартавалі аб сваіх працоўных поспехах. Камісар абласнога штаба СБА А. Бабчынскі паведаміў аб выніках спаборніцтва: будаўнічы атрад «Буравеснік-73» (камандзір Люда Агароднік, камісар Рычард Саматыя) заняў першае месца сярод рэспубліканскіх будаўнічых атрадаў, якія працавалі ў легендарнай Рудабельцы; атрад «Верасок» (камандзір Ася Надольская, камісар Валодзя Лайкоў) заняў першае месца ў Барысаўскай зоне. А атрад «Мара» быў лепшым сярод універсітэцкіх атрадаў, якія працавалі ў Малдавіі.

Са шчырымі словамі падзякі да будаўнікоў і добрымі пажаданнямі першакурснікам выступіла камсамолка 40-х гадоў, загадчыца кафедры беларускай літаратуры Вольга Васільеўна Казлова.

Сёння, як і заўсёды, радуючыся поспехам у вучобе і працы, мы памятаем аб тых, хто загінуў у барацьбе за наша светлае жыццё. У знак вялікай павагі і ўшанавання памяці загінуўшых студэнцкая дэлегацыя ўсклала кветкі да абеліска Перамогі.

У заключэнне ўрачыстай часткі святочнага вечара ў выкананні першакурснікаў прагучаў студэнцкі гімн «Гаудэамус». Пасля адбыўся канцэрт, удзел у якім прынялі байцы будаўнічых атрадаў і першакурснікі.

**З. ПРОХАРАВА,**
**студэнтка III курса.**

## ЗДАБУДЗЬЦЕ КРЫЛЫ!

— Кожным матэрыялам, кожным радком змагацца за дабро, гуманізм, сцвярджаць праўду на зямлі... — гучаць словы клятвы першакурснікаў факультэта журналістыкі.

Сёння ў іх незабыўны дзень — пасвячэнне ў студэнты. Дэкан факультэта прафесар Рыгор Васільевіч Булацкі жадае новаму папаўненню высока несці сцяг камунізму, быць сапраўднымі памочнікамі партыі.

Выпускніца факультэта Таццяна Кобрына, рэдактар рэспубліканскага радыё, ад шчырага сэрца заклікае вучыцца толькі на выдатна.

А потым старшакурснікі дасціпна выказваюць свае пажаданні поспехаў, студэнцкага аптымізму. «Не стой у чарзе за дыпломам» — такі дэвіз узялі да свайго выступлення студэнты чацвёртага курса.

А першакурснікі прадэманстравалі, як пачалося іх студэнцкае жыццё, занятк. Успомнілі пра першыя дні на бульбе, горкія пісьмы бацькам, якія пачыналіся: «Мілая мамачка, хачу дамоў!» Але цяпер успаміны — толькі добрыя. І вучыцца першакурснікі стараюцца як мага лепш.

Аднадушна першакурснікі былі прыняты ў вялікую сям'ю журфака.

Вось такім цікавым быў суботні вечар для тых, хто назаўсёды вырашыў стаць сапраўдным рыцарам пяра.

**В. ІОСЬКА,**
**студэнтка І курса.**

## РАЯЦЦА ВЫКЛАДЧЫКІ РОДНЫХ МОЎ І ЛІТАРАТУР

Нядаўна пры навукова-метадычным савеце па вышэйшай філалагічнай адукацыі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР створана новая секцыя—роднай мовы і літаратуры. Узначальваюць яе прадстаўнікі нашага універсітэта — прафесары М. Р. Ларчанка (старшыня) і Л. М. Шакун (намеснік старшыні). У Кішынёўскім дзяржаўным універсітэце імя У. І. Леніна адбылося першае пасяджэнне секцыі, на якім разгледжан шэраг пытанняў, якія звязаны са станам і задачамі выкладання родных моў і літаратур ва універсітэтах Украіны, Беларусі і Малдавіі. З дакладамі і паведамленнямі выступілі выкладчыкі вну з Кішынёва, Ужгарада, Кіева, Львова, Мінска, Душанбе і іншых гарадоў.

Асаблівая ўвага была звернута на якасць выкладання родных моў і літаратур, характар лекцыйных курсаў, спецкурсаў і спецсемінараў па гэтых прадметах, суадносіны лекцыйных курсаў і практычных заняткаў, наяўнасць і якасць праграм, падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў, прымяненне тэхнічных сродкаў навучання і г. д. Прызнана неабходным павялічыць на нацыянальных аддзяленнях універсітэтаў краіны колькасць гадзін па вядучых прадметах—родных мовах і літаратурах (не менш 45—50 працэнтаў ад агульнай колькасці гадзін, акрамя курсаў па выбару). Указваўся і канкрэтны шлях да гэтага: захаваўшы папярэднюю колькасць гадзін па сацыяльна-эканамічных дысцыплінах, скараціць іх па замежных мовах (за выключэннем факультэтаў замежных моў), а таксама некаторых дапаможных дысцыплін, выключыць асобныя з іх з вучэбнага плана. Гэта дапаможа паглыбіць спецыяльныя веды, папярэдзіць нагрузку студэнтаў, якая асабліва адчуваецца ў нацыянальных вну СССР. Была таксама звернута ўвага на недапушчальнасць дубліравання матэрыялу па спецыяльных дысцыплінах і дапаможных прадметах.

Секцыя рэкамендуе ўвесці ў новы вучэбны план некаторыя лекцыйныя курсы, у тым ліку «Уводзіны ў славянскую (раманскую, цюркскую, іранскую і г. д. — у залежнасці ад моўнага рэгіёна) філалогію», «Гісторыя славянскіх літаратур», «Гісторыя рэспублікі», «Гісторыя і тэорыя рускай і нацыянальнай крытыкі», «Культура роднай мовы». Разам з тым практыка камуністычнага будаўніцтва, а таксама сучасны стан філалагічнай навукі настойліва дыктуюць неабходнасць прадугледзець ва ўсіх нацыянальных універсітэтах, дзе гэтага яшчэ няма, спецыялізацыі па літаратуразнаўству і літаратурнай крытыцы і перакладазнаўству.

Асаблівая ўвага была ўдзелена выкладанню курса літаратур народаў СССР (падрыхтоўцы спецыялістаў, выпрацоўцы вучэбных праграм, напісанню падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў і г. д.). У праграме па гэтаму курсу неабходна шырэй прадставіць творчасць вядучых пісьменнікаў усіх нацыянальных літаратур. Адно з бліжэйшых пасяджэнняў секцыі вырашана прысвяціць канкрэтнаму аналізу стану і задач выкладання літаратур народаў СССР, абмеркаванню праекта новай праграмы курса гэтых літаратур.

Падкрэслена настойлівая неабходнасць развіцця даследаванняў па методыцы вузаўскага выкладання. Рэдакцыі часопіса «Філалагічныя навукі (навуковыя даклады вышэйшай школы)» рэкамендавана адкрыць новы аддзел «Пытанні тэорыі і практыкі навуковай методыкі выкладання мовы і літаратуры», дзе, разам з адлюстраваннем важнейшых навукова - тэарэтычных і практычных пытанняў у галіне універсітэцкай методыкі рэгулярна абмяркоўваць новыя праграмы і падручнікі па нацыянальных (родных) мовах і літаратурах. Вырашана таксама прасіць міністэрства разгледзець пытанне аб заснаванні перыядычнага агульнасаюзнага выдання (часопіса, навукова-метадычнага зборніка), прысвечанага тэорыі і практыцы навуковай методыкі выкладання рускай і іншых нацыянальных моў і літаратур у вышэйшай школе.

Усе члены секцыі выказаліся за тое, каб шырэй практыкаваць сістэматычны абмен выкладчыкамі паміж рэспубліканскімі універсітэтамі для чытання аглядных курсаў і спецкурсаў па літаратурах народаў СССР, параўнальнай граматыцы усходнеславянскіх моў, міжмоўных і міжлітаратурных кантактах і г. д. Вырашана ў будучым выкарыстоўваць для гэтых мэт вучоных, якія ўдзельнічаюць у пасяджэннях секцыі роднай мовы і літаратуры. Гэта з'явіцца адным з канкрэтных шляхоў рэалізацыі плана па абмену навуковым вопытам, дапаможа больш паглыбленаму спецыяльнаму навучанню студэнтаў-філолагаў.

Члены секцыі рашуча выказаліся за тое, каб у новым навучальным плане для рэспубліканскіх універсітэтаў былі прадугледжаны і напісанне студэнтамі-выпускнікамі дыпломных работ, і здача дзяржаўных экзаменаў па навуковаму камунізму, а таксама па нацыянальнай мове і нацыянальнай літаратуры (незалежна ад тэмы дыпломнай работы). Гэта выклікана як спецыфікай універсітэцкай адукацыі, так і задачай павышэння ўзроўню падрыхтоўкі маладых спецыялістаў.

**В. РАГОЙША,**
**вучоны сакратар секцыі,**
**дацэнт БДУ.**

# І ШТОДЗЁННЫМ СПРАВАМ—

### З ДАКЛАДА САКРАТАРА КАМІТЭТА

КІРУЮЧЫСЯ рашэннямі Камуністычнай партыі аб задачах вузаўскага камсамола, камітэт камсамола універсітэта ў справаздачны перыяд сканцэнтраваў сваю дзейнасць на павышэнні эфектыўнасці вучэбна-выхаваўчай работы. Паўсядзённая ўвага гэтым пытанням, безумоўна, садзейнічала таму, што ў зімовую сесію 1972-73 года агульная паспяховасць па універсітэту склала 92,11 працэнта. Прыемна, што ў нас стабільна высокая паспяховасць па грамадскіх дысцыплінах: гісторыі КПСС — 98,89 працэнта, філасофіі — 99,2, палітэканоміі — 98,5, навуковаму атэізму — 100 працэнтаў.

Вучэбная работа камсамольскіх бюро на многіх факультэтах — гістарычным, хімічным, журналістыкі — канкрэтызавалася, набыла свае закончаныя формы, стала аўтарытэтнай сярод студэнтаў. Прыкладам можа служыць работа камсамольскага бюро факультэта журналістыкі. Адставанне ў вучобе, беспрычынныя пропускі лекцый і спазненні, безадказныя паводзіны на занятках разглядаюцца тут як персанальная справа з далейшымі строгімі вывадамі. Наладжана на журфаку і канкрэтная дапамога адстаючым.

Важную ролю ў павышэнні паспяховасці набыло сацыялістычнае спаборніцтва груп, якое ў мінулым годзе праходзіла пад дэвізам «Вучыцца, працаваць і жыць па-камуністычнаму». Першае месца заняла група студэнтаў IV курса аддзялення палітэканоміі. На працягу ўсіх год вучобы яна была лепшай на факультэце. У групе няма троек, усе студэнты займаюцца навукова-даследчай работай, сем студэнтаў выступілі на студэнцкай навуковай канферэнцыі БДУ, прысвечанай 50-годдзю ўтварэння СССР, 11 удзельнічалі ў рэспубліканскім конкурсе, трое — ва усесаюзным. Усе без выключэння студэнты займаюцца грамадскай работай.

Непасрэдна к паспяховаму рашэнню вучэбна-выхаваўчых пытанняў прымыкае работа камітэта па прафарыентацыі. У арганізацыі гурткоў у падшэфных школах, у гарадскіх алімпіядах, школах юных фізікаў, хімікаў, біёлагаў, матэматыкаў, фестывалях ведаў, у днях адкрытых дзвярэй, на падшэфных прадпрыемствах, у домакіраўніцтвах, на падрыхтоўчых курсах, у грамадскай прыёмнай камісіі ў нас удзельнічала каля пяці тысяч чалавек.

Вялікае значэнне ў фарміраванні асобы студэнта набыла навукова-даследчая работа. Мы можам радавацца таму, што наш універсітэт ужо трэці год запар займае першае месца сярод вну рэспублікі і ўзнагароджан памятным кубкам «Навука». З 35 навукова-даследчых работ, прадстаўленых у мінулым годзе на Усесаюзны конкурс у Маскве, 17 атрымалі прызавыя месцы. У гэтым годзе наш універсітэт дасягнуў яшчэ большых вынікаў. Чацвёра студэнтаў: фізікі Валерый Новікаў і Аляксандр Рагачоў, матэматык Іван Сандрыгайла, біёлаг Генадзь Вынаеў узнагароджаны медалямі. Дыпломаў удастоены біёлаг Алег Давыдзенка, географ Галіна Гігевіч і студэнт ФПМ Анатоль Мяцельскі.

Год ад году расце колькасць навуковых работ, прадстаўляемых на конкурсы. У мінулым годзе студэнтамі падрыхтаваны 1563 навуковыя работы. Сёлета разгорнута падрыхтоўка да V Усесаюзнага конкурсу.

Камітэт камсамола універсітэта правёў у лютым канферэнцыю па праблемах ваенна-патрыятычнага выхавання і канферэнцыю, прысвечаную 10-годдзю універсітэцкага СБА. У гэтым асаблівая заслуга навуковага сектара, СНТ факультэтаў і універсітэта, якім кіруюць камуніст, выкладчык кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў У. Ф. Ладысеў і камсамолец, студэнт аддзялення палітэканоміі гістарычнага факультэта У. Анцімонік.

Камітэтам здзейснена вялікая ідэалагічная работа. Усе студэнты паспяхова здалі Ленінскі залік «Рашэнні XXIV з'езда КПСС — у жыццё!» Разам з намі Ленінскі залік здавалі в'етнамскія студэнты, студэнты з ГДР і Балгарыі.

Мы распрацавалі рэкамендацыі па грамадска-палітычнай практыцы, падрыхтавалі да выдання індывідуальны атэстат па грамадска-палітычнай практыцы і індывідуальнае заданне для студэнтаў па вытворчай практыцы. Адразу пасля нашай канферэнцыі прадстаіць вялікая і складаная работа па правядзенню атэстацыі па выніках мінулага года.

Накоплены вялікі вопыт шэфскай работы. Шэфскі сектар стаў адным з буйнейшых у фарміраваннях камітэта. У яго рабоце ўдзельнічае каля трох тысяч студэнтаў. У сферы ўздзеяння сектара 50 школ горада Мінска. У Кастрычніцкім і Заводскім раёнах працуюць нашы педатрады ў домакіраўніцтвах. У падшэфныя школы Дзяржынскага, Стаўбцоўскага, Барысаўскага раёнаў выязджаюць студэнцкія агітбрыгады. Толькі ў мінулым годзе было 40 такіх выездаў.

У ходзе Усесаюзнага агітпаходу студэнцкай моладзі школам вёскі аказана істотная дапамога: аформлена 11 ленінскіх пакояў і чырвоных куткоў, 36 стэндаў, перададзена 4217 кніг з аўтографамі студэнтаў. Фіналам гадавой работы з'яўляюцца злёт лепшых піянерскіх атрадаў, які праводзіцца ва універсітэце, і фестываль ведаў з запрашэннем вучняў 9-х і 10-х класаў падшэфных школ.

Заслугоўвае ўвагі інтэрнацыянальная работа. Пытанні жыцця, быту і адпачынку замежных студэнтаў стаялі ў цэнтры ўвагі інтэрсектара. У практыку работы ўвайшлі трохбаковыя дагаворы аб дружбе і супрацоўніцтве паміж зямляцтвамі замежных студэнтаў, камітэтам камсамола універсітэта і камітэтамі камсамола прадпрыемстваў г. Мінска. Часта адбываюцца гутаркі ў камітэце камсамола, прыёмы ў гонар інтэрнацыянальных свят. Такая садружнасць дазваляе шырэй арганізаваць работу, усебакова пазнаёміць замежных студэнтаў з савецкай рэчаіснасцю. Галоўны напрамак інтэрработы — наш удзел у кампаніі

# АДПАЧЫВАЦЬ, ДЫК ПА-САПРАЎДНАМУ

### З ВЫСТУПЛЕННЯ У. АЖЭГАБА, СТУДЭНТА III КУРСА ХІМІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА, УДЗЕЛЬНІКА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ

У сваім выступленні я пастараюся прааналізаваць работу культмасавага сектара камітэта камсамола хімічнага факультэта. У нас ён складаўся са студэнтаў IV курса, якія лічылі, што яны ўжо сваё адпрацавалі, і таму да сваіх абавязкаў адносіліся абыякава. Рэпетыцыі мастацкай самадзейнасці праводзіліся два разы ў год: перад факультэцкім і перад універсітэцкім аглядамі самадзейнасці. І цягнуліся яны з ранку да вечара. Тое, што павінна было дапамагаць выхаваўчаму працэсу, на справе давала адваротны вынік. Калі-нікалі прыходзілася нават прапускаць лекцыі. У нас амаль на кожным курсе ёсць свае агітбрыгады і вельмі многа жадаючых удзельнічаць у іх. Але тут заўсёды ўзнікае праблема транспарту.

Усе нашы факультэцкія вечары можна раздзяліць на дзве катэгорыі: тыя, на якія студэнты хадзілі толькі з-за танцаў або наогул не хадзілі, і тыя, якія былі сапраўднымі вечарамі са студэнцкім агеньчыкам, задорам і весялосцю. Чамусьці ў арганізацыі вечароў культурна-масавы сектар не прымаў амаль ніякага ўдзелу. Наогул, у яго не было сувязі ні з прафбюро, ні з камітэтам ДТСААФ. Вечары ж, за арганізацыю якіх браліся зацікаўленыя студэнты, агеньчыкі, дыспуты на розныя тэмы, навагодні вечар, дзень хіміка прыцягвалі ўсіх: і студэнтаў, і большасць выкладчыкаў, і нават студэнтаў іншых факультэтаў. Яркі прыклад—дзень хіміка, які рыхтавалі больш ста студэнтаў і на які прыехалі госці з універсітэтаў Казані, Рыгі, Ленінграда, Ульянаўска, Уфы.





Ідзе XXV справаздачна-выбарная кам самольская канферэнцыя.

# ГАВОРАЦЬ ДЭЛЕГАТЫ

Перад адкрыццём канферэнцыі нашы карэспандэнты задалі дэлегатам некалькі пытанняў, у тым ліку: чым знамянальны для вас мінулы навучальны год; чаго вы чакаеце ад сёлетняга камсамольскага форуму?



**НІНА САЧКОВА,**

*геафак, II курс, адказная за палітыка-выхаваўчую работу ў групе:*

**Паступіўшы ва універсітэт, была на сёмым небе ад шчасця, амаль уся энергія была сканцэнтравана на вучобе. Цяпер я ўжо на II курсе і зразумела, што змагу ўнесці ў жыццё факультэта і яшчэ штосьці, акрамя выдатнай вучобы.**

**Цяпер усе думкі толькі аб адным — апраўдаць давер'е групы, якая выбрала мяне дэлегатам на канферэнцыю.**

**МІКАЛАЙ КОРЗУН,**

*юрфак, II курс, сакратар камсамольскай арганізацыі факультэта:*

**З чым прыйшоў факультэт к канферэнцыі! Мне вельмі прыемна, што павысілася паспяховасць. Добра, рэзультатыўна прайшла грамадска - палітычная атэстацыя студэнтаў і супрацоўнікаў. Ёсць чым ганарыцца факультэту!**



ВОСЬ ужо два гады, як у нас на факультэце ўведзена новая структура камсамольскіх арганізацый старэйшых курсаў — аб'яднанне студэнтаў III—V курсаў і камсамольцаў-супрацоўнікаў у кафедральныя камсамольскія арганізацыі. Якія вынікі гэтай перабудовы, ці карыснае гэта нaваўвядзенне?

Стварэнне кафедральных камсамольскіх арганізацый умацавала сувязі камсамольскай арганізацыі з выкладчыцкім калектывам. У мінулым навучальным годзе ў нас на кафедры электрафізікі фізічнага факультэта рэгулярна праводзіліся адкрытыя камсамольскія сходы, у якіх прымалі ўдзел выкладчыкі кафедры. Узніmаліся пытанні паспяховасці, наведвання заняткаў, ішла прынцыповая размова аб адносінах студэнтаў да сваіх прамых абавязкаў.

Каб павысіць паспяховасць, прадстаіць яшчэ многае зрабіць. Трэба будаваць работу акадэмічных сектараў больш прынцыпова, вастра. І мэтай гэтай работы павінна быць не толькі падцягванне непаспяваючых, але і павышэнне паспяховасці ўсіх студэнтаў і галоўным чынам студэнтаў-троечнікаў.

Рэзка актывізавалася і навуковая работа студэнтаў. У сваіх сацыялістычных абавязацельствах к Ленінскаму заліку многія студэнты запісалі: «Падрыхтаваць даклад да універсітэцкай навуковай канферэнцыі». У мінулым годзе падрыхтавана і прачытана дзевяць дакладаў і пяць было прадстаўлена на рэспубліканскі конкурс студэнцкіх работ, тры рэкамендаваны да друку, адзін прачытан на міжвузаўскай канферэнцыі ў Петразаводску.

Кіраўніцтва кафедры рашае многія вытворчыя і выхаваўчыя пытанні разам з камсамольскім бюро. Нават пры падборы студэнтаў на гаспадарча-дагаворныя работы кіраўнікі звяртаюцца за парадай к сакратару і членам бюро.

Больш мэтанакіраванай стала палітыка-выхаваўчая работа. У мінулым навучальным годзе быў арганізаван цыкл лекцый па розных тэмах.

На жаль, і недахопаў пакуль шмат. Адна з галоўных праблем — правядзенне камсамольскіх сходаў. Студэнты займаюцца ў розныя змены, і нам прыходзіцца прасіць выкладчыкаў перанесці лекцыі, лабараторныя работы. Ясна, што падобнае нарашэнне нельга лічыць выхадам са становішча.

Другі і, лічу, больш сур'ёзны недахоп — камітэт камсамола фізфака прадаўжае працаваць па-старынцы... Відавочна, што тыя формы работы, якія падыходзяць для паточных камсамольскіх арганізацый, не зусім падыходзяць для арганізацый кафедральных. Патрэбны новыя, спецыфічныя формы. Камітэт камсамола факультэта пакуль не можа прапанаваць нічога канкрэтнага.

# НАШЫ ПРАБЛЕМЫ

### З ВЫСТУПЛЕННЯ А. БАРКОВАЙ, СТУДЭНТКІ V КУРСА ФІЗІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА

Вось і атрымліваецца, што кафедральныя камсамольскія арганізацыі існуюць як бы самі па сабе, а іх сувязь з камітэтам камсамола факультэта часта заключаецца толькі ў своечасовай здачы ўзносаў. А кафедральныя ж камсамольскія арганізацыі могуць і павінны стаць галоўнай апорай у рабоце са студэнтамі як старэйшых, так і малодшых курсаў.

Патрабуюць перабудовы некаторыя традыцыйныя сектары. Трэба расшырыць паняцце шэфскай работы. Было б вельмі карысна, калі б кафедральныя арганізацыі шэфствавалі не толькі над школай, а і над студэнтамі I—II курсаў. Кафедра ж дае магчымасць і матэрыяльную базу для больш ранняга прыцягнення іх у актыўную навукова-даследчую работу. Тут патрэбен больш цесны кантакт кафедральных камсамольскіх арганізацый і савета СНТ. Гэта прынесла б вялікую карысць.

# КАЛІ ТАБЕ ДАВЕРЫЛІ...

### З ВЫСТУПЛЕННЯ Р. САМАТЫІ, КАМІСАРА СБА «БУРАВЕСНІК-73»

З чаго пачынаецца арганізацыя будаўнічага атрада? Перш за ўсё, з камандзіра і камісара. Яны ў нас самыя аўтарытэтныя камсамольскія актывісты, часцей за ўсё камуністы, выдатнікі вучобы. Калі табе даверылі пост камандзіра,, то ці можаш ты вучыцца на тройкі? Калі цябе назначылі камісарам, ці маеш ты права не быць знаёмым з вопытам работы ў гэтай галіне? А для таго, каб цікава прайшоў любы вечар—сустрэча з вясковай моладдзю, ветэранам працы ці вайны, каб умела правесці тэматычную палітінфармацыю ці прачытаць лекцыю, правільна падабраць рэпертуар выступлення атраднай брыгады або наладзіць работу ў піянерлагеры «Спадарожнік», трэба вучыцца, вучыцца ў тых, у каго за плячыма не адзін працоўны семестр. З гэтай мэтай, дарэчы, няблага было б у нас ва універсітэце на ФГП адкрыць аддзяленне па падрыхтоўцы кіраўнікоў СБА.

**Матэрыялы падрыхтавала група прэс-цэнтра камітэта камсамола.**

**Фота М. Хамца і Л. Новікава.**

# ВЯЛІКУЮ ЭНЕРГІЮ

**КАМСАМОЛА А. Г. СЛУКІ**

«Юнацтва выкрывае імперыялізм».

Штогод у красавіку мы праводзім фестываль інтэрнацыянальнай дружбы, які выліваецца ў сапраўднае свята. На яго запрашаем моладзь з падшэфных прадпрыемстваў, ветэранаў працы і герояў вайны.

Высокае майстэрства на працягу многіх год паказваюць нашы калектывы мастацкай самадзейнасці: народны ансамбль танца «Крыжачок», народны аркестр народных інструментаў, народная харавая капэла, студэнцкі тэатр. Паспяхова развіваюць самадзейнае мастацтва філалагічны, геаграфічны, юрыдычны факультэты, факультэт журналістыкі.

Наш універсітэт прызнан адным з вядучых у краіне па арганізацыі ваенна-патрыятычнага выхавання. Мы сёння павінны аддаць належнае савету ветэранаў вайны, камітэту ДТСААФ, ваеннай кафедры і асабліва выкладчыку І. В. Марчанку за пастаянную і значную дапамогу ў арганізацыі патрыятычнага выхавання.

Наш студэнцкі будаўнічы атрад, другі па велічыні ў Беларусі, пастаянна спраўляецца з вытворчымі заданнямі і перавыконвае іх. У рашаючым годзе дзевятай пяцігодкі асвоена тры мільёны капіталаўкладанняў, і мы можам ганарыцца, што ў студэнцкім мільярдзе — нашы тры мільёны.

Інтэрнацыянальныя атрады універсітэта, якія працавалі ў Балгарыі і ГДР, ужо два гады запар займаюць прызавыя месцы. Гэта заслужаны поспех нашых байцоў і камандзіраў.

На фоне зробленага ясна відаць нашы недахопы, упушчэнні, нявыкарыстаныя магчымасці і рэзервы. Толькі па выніках вясенняй сесіі гэтага года ў нас 749 двоечнікаў і 294 троечнікі. Прапушчана 20356 гадзін, атрымалі змешаныя адзнакі 2837 чалавек. І агульная паспяховасць (90,7 працэнта) ніжэй, чым у 1971-72 навучальным годзе.

Неабходна патрабаваць ад камсамольскіх арганізацый вучэбных груп, кафедр, факультэтаў сур'ёзна заняцца праблемай «тройкі». Іменна тут крыюцца рэзервы павышэння паспяховасці, а значыць, і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў.

Прыведзеныя лічбы гавораць і аб тым, што работа акадэмічных сектараў часта зводзіцца толькі к фіксаванню пропускаў заняткаў, нездавальняючых адзнак. Яны не арганізуюць сістэматычнай прафілактычнай работы, рэдка выклікаюць адстаючых студэнтаў для справаздач. На фізічным, біялагічным, ФПМ слаба прыжываюцца формы дапамогі першакурснікам і адстаючым.

За мінулы год з універсітэта, з усіх форм навучання, адлічана 805 чалавек, з іх 424 — за непаспяховасць: фізічны — 107 чалавек, матэматычны—42, філалагічны — 80. Вялікая віна ляжыць на камсамольскіх арганізацыях гэтых факультэтаў. На працягу года камсамольскія бюро рэдка ставяць пытанні вучобы ў павесткі дня камсамольскіх сходаў, а калі і ставяць, то абмяжоўваюцца фармальным абмеркаваннем. Камсамольскія бюро не выканалі пастанову бюро камітэта камсамола аб строгім прыцягненні да адказнасці лодыраў і разгільдзяеў. У многіх групах пануюць абставіны заспакоенасці, панібрацкіх адносін да прагульшчыкаў і хвасцістаў.

Камсамольскія бюро не кантралююць акадэмічныя сектары і камісіі, якія працуюць часта без планаў, не праводзяць пасяджэнняў і не выклікаюць адстаючых студэнтаў для абмеркавання.

Лепш трэба арганізаваць студэнцкую навуковую работу. У нас слабая сувязь з кафедрамі грамадскіх навук, да гэтай пары мы не дабіліся палажэння, каб кожны выкладчык быў навуковым кіраўніком студэнцкіх работ. Вельмі слаба прыцягваюцца да навуковага кіраўніцтва аспіранты, няма дастаткова трывалай сувязі паміж саветам па НДРС, СНТ, саветам маладых вучоных і навуковым сектарам камітэта камсамола.

На факультэтах часам няўважліва ставяцца к падбору камсамольскага актыву. Бюро камітэта камсамола універсітэта вызваліла ад работы сакратара камітэта камсамола гістфака Расохіна, намесніка сакратара ФПМ Гедрановіча, строга пакарала сакратароў хімічнага і фізічнага факультэтаў.

З 53 выбраных на XXIV канферэнцыі членаў камітэта актыўна дзейнічалі не больш 25. Дрэнна працавалі Балакін (гістфак), Курылёва (юрфак), Азараў (ФПМ), Данілеўскі (фізфак), Падалінская (біяфак).

Патрабуе паляпшэння ідэалагічная, выхаваўчая работа. У нас 23 чалавекі выключаны за амаральныя паводзіны, 18 чалавек толькі ў 1973 годзе выселены з інтэрната, 117 чалавек за справаздачны перыяд атрымалі розныя камсамольскія спагнанні, у тым ліку 53 — строгія вымовы з занясеннем ва ўліковую картку.

Вельмі нераўнамерна размяркоўваюцца грамадскія даручэнні. Мы праверылі групу другога курса філфака (камсорг Бянецкі). Загружанасць грамадскімі даручэннямі — 100 працэнтаў, гістфака (Сярдзюк) — 60, геафака (Куцэра)—45, яшчэ меншая колькасць на матфаку, ФПМ, фізфаку.

Пры ўсіх нашых дасягненнях у развіцці мастацкай самадзейнасці ва універсітэце на факультэтах яна развіта слаба. Пастаянных калектываў на факультэтах у нас фактычна няма. Рэдка выступаюць нашы вядучыя калектывы. Таму неабходна шырэй практыкаваць, як гэта пачыналася ў мінулым годзе, выступленні агітбрыгад у інтэрнатах, арганізацыю вечароў адпачынку на факультэтах.

Патрабуе далейшага ўдасканалення практыка арганізацыі СБА. Хоць прайшло ўжо 10 год універсітэцкай цаліны, не створаны школы кадраў камандзіраў і камісараў. Камандны састаў гістфака, фізфака, юрфака патрабуе рашучага паляпшэння. Наспела неабходнасць выпускаць хоць бы чатыры нумары газеты «Беларускі універсітэт» на студэнцкай будоўлі», стварыць штаб, прадугледжаны уставам СБА з прадстаўнікоў рэктарата, АГЧ, парткома, медыцынскіх работнікаў і студэнтаў, замацаваць факультэты за гаспадаркамі рэспублікі, каб можна было складаць перспектыўны план будаўнічых работ не менш чым на пяцігодку.

# СВЯЦІЦЬ ЗАЎСЁДЫ

**З ВЫСТУПЛЕННЯ М. ЗЫЛЯ, НАЧАЛЬНІКА ШТАБА «КП» УНІВЕРСІТЭТА**

«Камсамольскі пражэктар» ва універсітэце аб'ядноўвае каля 150 чалавек. Гэта штаб «КП» універсітэта, факультэцкія штабы «КП» і пасты «КП» на курсах. Асноўныя формы работы—аператыўныя праверкі, рэйды, агляды. Галоўнае ў рабоце—не толькі высвятляць недахопы і парушэнні, а папярэджваць іх, дапамагаць ліквідаваць.

З мэтай галоснасці работы па найбольш злабадзённых пытаннях штабамі «КП» выпускаюцца «маланкі» або «баявыя лісткі», якія з'яўляюцца найбольш дзейснай і аператыўнай формай галоснасці. Так, за справаздачны перыяд штабамі «КП» выпушчана 63 газеты і 80 «маланак» і «баявых лісткоў».

Аднак не ўсе штабы «КП» факультэтаў працуюць па планах і вядуць дакументацыю. Папрок перш за ўсё штабам «КП» фізфака, ФПМ, геафака, журфака. І гэта невыпадкова. З 9 пасяджэнняў штаба «КП» універсітэта на 7 з іх адсутнічаў старшыня штаба геафака В. Смірноў, на 8 — Л. Юшчанка (біяфак) і А. Крачкоўскі (філфак), на 6—М. Шэлехаў (журфак). Не дзіўна, што выпускаемыя гэтымі штабамі газеты былі вельмі нізкай якасці і мала адпавядалі свайму назначэнню.

Няма ў штабаў «КП» факультэтаў дзейснага кантакту з групамі народнага кантролю. Сумесныя мерапрыемствы амаль не праводзяцца на біялагічным, геаграфічным, хімічным факультэтах.

У выніку агляду-конкурсу лепшым быў прызнан штаб «КП» гістфака. Характэрныя рысы ў яго рабоце—арганізаванасць, аператыўнасць, высокая дысцыплінаванасць. Ва ўсіх групах факультэта былі створаны пасты «КП», што дазволіла штабу пастаянна быць у курсе спраў. З актывам «КП» факультэта было праведзена двое заняткаў.

Члены штаба «КП» універсітэта прымаюць актыўны ўдзел у рабоце гарадскога і раённага штабаў «КП». Так, напрыклад, В. Курыленкаў, А. Мышкоўскі ўдзельнічалі ў рэйдзе па праверцы дзіцячых пакояў пры домакіраўніцтвах. Аператыўна рэагуе штаб і на сігналы. Так, Л. Ермаковіч і Л. Гарадзецкі высветлілі магчымасць паляпшэння работы гардэроба ў галоўным корпусе. Матэрыял аб гэтым быў апублікаван у газеце «Беларускі універсітэт». У выніку работа гардэроба значна палепшылася.

Пастаянную цікавасць да работы штаба «КП» праяўляе камітэт камсамола. Работа штаба знаходзіцца ў цэнтры ўвагі партыйнага камітэта універсітэта. На пасяджэнні парткома ў сакавіку 1973 года было ўказана, што штаб «КП» не ў поўную меру выкарыстоўвае насценны друк і газету «Беларускі універсітэт» у мэтах галоснасці праводзімых мерапрыемстваў. Партком адзначыў і станоўчую ролю работы штаба «КП» па камуністычнаму выхаванню студэнтаў.

Штаб «КП» лічыць, што эфектыўнай будзе работа па заданнях груп народнага кантролю і партыйных арганізацый.

Камсамольскім бюро факультэтаў неабходна павысіць ступень кантролю за работай штабаў «КП» факультэтаў, якасцю выпускаемых нумароў «КП», вядзеннем дакументацыі штабамі «КП» і часцей заслухоўваць іх справаздачы. Штабу «КП» універсітэта трэба часцей выступаць на старонках газеты «Беларускі універсітэт» і адкрыць пастаянную рубрыку «Гаворыць штаб «КП». Асаблівую ўвагу трэба ўдзяліць кадрам штабаў «КП», матэрыяльнай базе.



Рэгістрацыя дэлегатаў.

**Адбыўся першы, арганізацыйны пленум камітэта камсамола. Зацверджана бюро ў саставе 11 чалавек. Сакратаром камітэта камсамола выбран Уладзімір Аляксандравіч Наумовіч, выкладчык кафедры беларускай літаратуры філалагічнага факультэта.**

**Намеснікам па ідэалагічнай рабоце выбран Уладзімір Сілін, па арганізацыйнай — Васіль Пінчук. Штаб «КП» узначаліў Пётр Іванавіч Брыгадзін, загадчык кабінета гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў.**

# ДАПАМАГАЕ ВУЧОБА

**З ВЫСТУПЛЕННЯ Н. МАКІЁНАК, КІРАЎНІКА АКАДЭМІЧНАЙ КАМІСІІ БІЯЛАГІЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА**

Акадэмічная камісія нашага факультэта аб'яднала ў сваім саставе адказных за акадэмічны сектар камітэта камсамола, членаў вучэбна-вытворчай камісіі прафбюро, адказных за акадэмічную работу ў групах і на кафедрах—усяго 17 чалавек. Мы выдзелілі два асноўныя напрамкі ў рабоце: бягучая паспяховасць і наведванне лекцый; работа з першакурснікамі.

Што канкрэтна зроблена? Адказныя за акадэмічную работу ў падгрупах вялі сшыткі ўліку, і па іх матэрыялах мы выпускалі спецыяльныя інфармацыйныя бюлетэні.

Практыкаваліся рэйды-праверкі. Так, напрыклад, была праверана ступень падрыхтоўкі студэнтаў да семінарскіх заняткаў па ўсіх грамадскіх дысцыплінах. Перад сесіямі мы правяралі стан чытальных залаў інтэрнатаў, аудыторый і лабараторый.

Вынікі сесій абмяркоўвалі на пасяджэннях камісіі. Выклікалі непаспяваючых і парушальнікаў дысцыпліны. Неаднаразова гутарылі са студэнтамі Малковай і Стрэльскім, але гэта не дало станоўчых вынікаў, і, нарэшце, прыйшлося хадайнічаць перад дэканатам аб іх выключэнні.

Рабоце з першым курсам удзялялася асаблівая ўвага. У кожную групу былі пасланы камсамольскія куратары, каб дапамагчы учарашнім школьнікам хутчэй увайсці ў студэнцкае жыццё. Сумесна з адказнымі за акадэмічны сектар камітэта камсамола хімфака была зроблена спроба правядзення кансультацыйных заняткаў з першакурснікамі па неарганічнай хіміі (самаму цяжкаму прадмету ў I семестры). Па шэрагу прычын такія заняткі былі праведзены не ва ўсіх групах.

Нельга не сказаць і аб недахопах. Перш за ўсё—гэта недастатковая галоснасць. Мы прыйшлі да высновы, што неабходны цесны кантакт з «Камсамольскім пражэктарам», і вырашылі ўвесці прадстаўніка «КП» у саставу камісіі. Не заўсёды былі прынцыповымі рашэнні акадэмічнай камісіі і, галоўнае, не заўсёды даводзіліся яны да ведама ўсіх студэнтаў.

Хочацца некалькі слоў сказаць і ў папрок камітэту камсамола універсітэта. Слабай, на наш погляд, была метадычная дапамога акадэмічным сектарам, інфармацыйная работа. На кожным жа факультэце з году ў год па крупіцах накопліваецца пэўны станоўчы вопыт работы, і абагульніць гэты вопыт, распрацаваць метадычныя ўказанні, якія так неабходны ў пачатку работы, — справа камітэта камсамола. Вельмі ж дапамагла навукова-практычная канферэнцыя, арганізаваная пасля зімовай сесіі і прысвечаная рабоце вучэбнага сектара ў час сесіі. Сабраліся прадстаўнікі акадэмічных сектараў усіх факультэтаў, абмяняліся вопытам. Пабольш бы такіх канферэнцый і менавіта па арганізацыі бягучай работы!

І яшчэ... У красавіку ва універсітэце праходзяць навуковыя канферэнцыі. Было б вельмі добра, калі б існавала секцыя камсамольскай работы.

# ГАВОРАЦЬ ДЭЛЕГАТЫ



**АНАТОЛЬ ХАДАСОК, ФПМ, II курс:**

**Год знамянальны сустрэчамі: з БДУ, з прыкладной матэматыкай, з новымі людзьмі.**

**Хачу пачуць адкрытую і справядлівую крытыку недахопаў у працы камсамольскай арганізацыі, якія, на жаль, яшчэ не выкаранены. Упэўнен, пасля канферэнцыі камсамольскае жыццё універсітэта яшчэ больш ажывіцца, заб'е крыніцай.**

**ВАСІЛЬ ДРАГАВЕЦ, журфак, V курс, староста курса:**

**X Сусветны фестываль моладзі і студэнтаў —гэта самая знамянальная падзея не толькі ў гэтым годзе, але і ў жыцці.**

**Думаю, канферэнцыя будзе садзейнічаць новаму ўздыму камсамольскай работы ва універсітэце.**



**АЛЕНА ТЫЛЕЦ,**

**філфак, III курс, член камітэта камсамола факультэта:**

**Больш за ўсё запомніўся КВЗ паміж філфакам і журфакам, калі мы, нарэшце, перамаглі нашых вечных сапернікаў - журналістаў.**

**На канферэнцыі хочацца пачуць аб вопыце работы ў лепшых камсамольскіх арганізацыях універсітэта.**



# КАЛЯНДАР ЗНАМЯНАЛЬНЫХ ДАТ

**6 лістапада** — 30 год з дня вызвалення (1943) часцямі Савецкай Арміі горада Кіева ад гітлераўскіх захопнікаў.

**7 лістапада** — 56 год Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

**8 лістапада 1917 года** — II Усерасійскі з'езд Саветаў аб'явіў аб пераходзе ўсёй улады ў рукі Саветаў. З'езд прыняў дэкрэты аб міры, аб зямлі і стварыў першы Савецкі ўрад —Савет Народных Камісараў — на чале з У. І. Леніным.

**8 лістапада** —30 год з дня заснавання (1943) ордэна «Перамога» і ордэна Славы.

**9 лістапада** —20 год з дня абвяшчэння (1953) незалежнасці Камбоджы.

**10 лістапада** — Дзень савецкай міліцыі.

**10 лістапада** — Сусветны дзень моладзі.

**13 лістапада** — 90 год з дня нараджэння І. П. Бардзіна (1883—1960), савецкага вучонага-металурга.

**14 лістапада** — 70 год з дня нараджэння А. В. Косарава (1903—1939), дзеяча камуністычнага руху савецкай моладзі.

**17 лістапада 1970 года** — упершыню ў гісторыі касманаўтыкі на Месяц дастаўлен савецкі аўтаматычны самаходны апарат, кіруемы з Зямлі — «Лунаход-1».

**17 лістапада** — Міжнародны дзень студэнтаў.

**19 лістапада** — Дзень ракетных войск і артылерыі.

**22 лістапада** — 30 год з дня абвяшчэння (1943) незалежнасці Лівана.

**26 лістапада 1924 года** — абвяшчэнне Мангольскай Народнай Рэспублікі.

**26 лістапада** — 70 год з дня нараджэння (1903) Ю. І. Піменава, савецкага жывапісца.

**28 лістапада 1820 г.** — нарадзіўся Фрыдрых Энгельс.

**29 лістапада 1945 года** — абвешчана Федэратыўная Рэспубліка Югаславія (цяпер Сацыялістычная Федэратыўная Рэспубліка Югаславія). Нацыянальнае свята Югаславіі.

**29 лістапада 1944 г.** — вызваленне Албаніі ад фашысцкіх акупантаў. Дзень вызвалення Албаніі.

**29 лістапада 1920 г.** — устанаўленне Савецкай улады ў Арменіі.





**З вялікім поспехам прайшоў канцэрт аб'яднаных агітбрыгад юрфака і журфака ў падшэфнай воінскай часці. Студэнты вельмі старанна рыхтаваліся да гэтай сустрэчы. Парадавалі сваіх гледачоў выдатнымі выступленнямі вакалісты, танцоры і нават ілюзіяніст-аматар.**

**На здымку (злева): студэнты журфака Іра Чабатар, Люда Нікуліна, Уладзімір Лялека.**

Фота **Г. Марозава.**

# СЕЯЦЬ МУДРАЕ, ВЕЧНАЕ

Кожны нумар насценгазеты «Слова філолага» на філалагічным факультэце — своеасаблівае свята. Ледзь толькі двухметровае «дзецішча» рэдкалегіі зойме сваё месца пад шклом, як вакол ужо збіраецца натоўп. Хто задаволена ўсміхаецца, хто імкнецца паказацца раўнадушным, а бываюць і пакрыўджаныя. Тым не менш цяжка знайсці чалавека, які б хаця на хвілінку не спыніўся ля стэнда.

Спыніліся і мы, тым больш, што гэта першы нумар, зроблены новай рэдкалегіяй. Пачынаецца ён з перадавіцы — «Вышэй узровень ведаў!». Намеснік дэкана М. М. Піпчанка аналізуе вынікі летняй экзаменацыйнай сесіі, выяўляе недахопы і прабелы ў арганізацыйна - выхаваўчай рабоце. З летняй сесіяй філолагі справіліся добра, і сведчанне таму — другое месца сярод факультэтаў універсітэта. Але, як справядліва зазначае аўтар, многае яшчэ не так, як хацелася б.

Пад рубрыкай «Гавораць першакурснікі» сваімі ўражаннямі і клопатамі аб вучобе дзеляцца Р. Сямак, Л. Мележ, Л. Міцько. Уборцы «другога хлеба» ў калгасах Чэрвеньскага раёна прысвяцілі свае карэспандэнцыі В. Каратай, Т. Сянчыла і А. Юшкевіч. Аб працоўных буднях СБА «Верасок» піша ў газеце камісар атрада У. Лайкоў.

Зусім нядаўна на факультэце была ўрачыста адзначана 24-я гадавіна з дня ўтварэння ГДР. Гэтая значная падзея знайшла сваё адлюстраванне на старонках «Слова філолага».

Трэцюю частку газеты займае паэзія — творчасць пачынаючых літаратараў. Літстаронка мае сваю даўнюю гісторыю. Калісьці тут змяшчалі свае творы П. Броўка і П. Трус, А. Лопка і Н. Гілевіч, Я. Янішчыц і Ю. Голуб — амаль палова Саюза пісьменнікаў БССР.

Традыцыі старэйшых працягвае моладзь. Вершы Л. Тарасюк, І. Рубіна, Я. Мальчэўскай, М. Куляша хоць і не пазбаўлены некаторай долі вучнёўства, тым не менш прыцягваюць увагу сваім адметным светаадчуваннем, уласным бачаннем навакольнага.

Першы нумар насценгазеты маладой рэдкалегіі атрымаўся. І справа не толькі ў добрым мастацкім гусце, маляўнічасці, справа ў сур'ёзным стаўленні да даручанай справы. Разам з тым хочацца пажадаць рэдкалегіі смялей выкарыстоўваць фотаздымкі з жыцця факультэта, універсітэта, не абмяжоўвацца даўно ўведзенымі рубрыкамі, творча падыходзіць да кожнага нумара. Тады газета зможа стаць не толькі калектыўным арганізатарам і агітатарам, але і калектыўным выхавацелем, сейбітам мудрага, вечнага.

**М. ПРЫГОДЗІЧ.**

## НОВЫЯ КНІГІ ПА ФІЛАСОФІІ,

**якія паступілі ў бібліятэку БДУ ў кастрычніку**

1. Гельвеций, Клод Адриан. Сочинения. В 2-х т. Перевод. Т. I. М. «Мысль», 1973.
2. Ерунов, Б. А. Мнение в системе человеческого познания. Курс лекций. Л. 1973.
3. Майснер, Герберт. Теория конвергенции и реальность. Пер. с нем. М. «Прогресс», 1973.
4. Оруджев, З. М. Диалектика как система, М. Политиздат, 1973.
5. Пантин, И. К. Социалистическая мысль в России: переход от утопии к науке. М. Политиздат, 1973.
6. Паркин, В. Ф. Диалектика свободы и необходимости при социализме. Учеб. пособие для вузов. М. «Высш. школа», 1973.
7. Расизм — идеология империализма, враг общественного прогресса. М. «Наука», 1973.
8. Соковнин, В. М. О природе человеческого общения (опыт философского анализа). Фрунзе, «МЕКТЕП», 1973.
9. Урсул, А. Д. Отражение и информация. М. «Мысль», 1973.
10. Человек — наука — техника. Опыт марксистского анализа науч.-техн. революции. М. «Политиздат». 1973.

**ПА СТАРОНКАХ НАСЦЕНГАЗЕТ**

# Дружба — Freundschaft

Гэтым летам студэнты нашага універсітэта і сярод іх будучыя юрысты працавалі ў інтэратрадзе, які дыслакаваўся ў Мінску.

К прыезду студэнтаў Патсдамскага педагагічнага інстытута мы рыхтаваліся старанна: вывучалі розную літаратуру аб ГДР, яе прамысловасці, сельскай гаспадарцы і іншых галінах жыцця. Асабліва цікавіла нас жыццё нямецкай моладзі. На многія пытанні даў адказ генеральны консул ГДР у Мінску Л. Волерт, сустрэча з якім адбылася ў нас у перыяд фарміравання атрада.

Адразу пасля сустрэчы мы паказалі нашым нямецкім сябрам горад, а вечарам сабраліся ў інтэрклубе, які афармілі сваімі рукамі. Скаванасць першых мінут хутка прайшла, і завязалася ажыўленая гутарка, прычым у ход пайшлі і нямецкая, і руская, і англійская мовы, і, канешне, мова жэстаў. З часам мы вельмі добра навучыліся разумець адзін аднаго. Многа даведаліся аб падрыхтоўцы X Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў, аб жыцці і вучобе нашых сяброў, расказвалі ім аб сваіх справах, камсамоле, універсітэце, Беларусі.

Непасрэдным аб'ектам работы атрада была ўсесаюзная будоўля бальніцы ў Бараўлянах. Студэнты з ГДР з цікавасцю ўнікалі ў працэс будаўніцтва і працавалі вельмі старанна. Надоўга ім, напэўна, запомняцца словы «трамбоўка», «шлакабетон», «давай-давай», «перакур». На будоўлі мы пасябравалі з рабочымі, якія заўсёды стараліся дапамагчы нам. Але мы не толькі працавалі: па вечарах праводзілі гутаркі, лекцыі, дыспуты, арганізоўвалі вечары танцаў, песні і, канешне, традыцыйны рускі чай, які вельмі спадабаўся нашым нямецкім сябрам. З вялікім задавальненнем мы паказвалі сталічныя музеі і тэатры, помнікі і паркі.

Усім інтэратрадам мы правялі «Дзень дружбы». Пачаўся ён мітынгам. Выступілі прадстаўнікі Бангладэш, Кубы, ГДР, Беларусі. Затым адбыліся спартыўныя сустрэчы, касцёр дружбы, а позна вечарам—агульны канцэрт для мясцовых жыхароў. У заключэнне ўсе прысутныя ў зале дружна спявалі на розных мовах Гімн дэмакратычнай моладзі. Месяц праляцеў вельмі хутка, а разлучыліся мы вялікімі сябрамі, бо не дарэмна назва нашага атрада — «Дружба».

**Т. КАРПАВА, студэнтка.**
**(«Савецкі юрыст»).**

# СТЫПЕНДЫЯ

**ГУМАРЭСКА З СУМНЫМ КАНЦОМ**

Спяшаючыся, я перабег вуліцу і на хвілінку спыніўся ля газетнага кіёска, каб купіць «Вячорку».

— Ну, як справы, стары? — падышоў да мяне знаёмы студэнт - трэцякурснік. — Абжываешся пціху?

— Абжываюся, — я не стрымаў радаснай усмешкі. — Вось стыпендыю іду атрымліваць.

Мой знаёмы лясчуў мяне па плячы і ўзрушана сказаў:

— У цябе сёння вялікі дзень, сябар.

Ён адкашляўся:

— Ты, браце, студэнт малады, таму паслухай маю параду. Як толькі атрымаеш свае 40 рублёў, адразу ж, не адыходзячы ад касы...

— Паралічыць... — не стрымаўся я.

— Ды не, не тое! — незадаволена прамовіў хлопец. — Што іх там паралічваць. Усё адно больш за сорак не налічыш. Ты лепш адразу размяркуй свой студэнцкі заробак, каб дажыць да наступнага.

— Дажыву як - небудзь! — я паімкнуўся ісці.

— Ды пачакай ты,—спыніў сябар. —лепш паслухай. Быў і я калісьці такім жа нецярплівым... Атрымаў, памятаю, сваю першую стыпендыю і ў той жа вечар патраціў з сябрамі амаль сем рублёў. Назаўтра купіў шырокі, стракаты гальштук у магазіне. Засталося ад стыпендыі рублёў 26. Потым пайшлі розныя ўзносы ў самыя розныя таварыствы і арганізацыі. У выніку «разбеглася» яшчэ больш як тры рублі.

Вечарам, пасля лекцый, з дзяўчынай, якая мне падабалася, мы пайшлі ў кіно. На маю бяду, фільм быў двухсерыйны, ды яшчэ з марожаным. Неяк даседзеўшы да канца, мы выйшлі на вуліцу. Зноў на вочы трапілася марожанае, шакаладнае, каб на яго ліха. Давялося браць. Потым зайшлі ў кафэ. Калі я выцягнуў з кішэні тры з паловай рублі, каб разлічыцца, з вачэй у мяне ледзь не пырскнулі слёзы. Але я мужна стрымаўся — усё ж такі мужчына.

Затым я толькі і паспяваў лазіць у кішэню па рублі. За інтэрнат аддаў 8, за тое, што пастрыгся, — 60 капеек. Спатрэбіліся фотакарткі на пасведчанне народнага дружынніка — паўрубля. Калі наша група збіралася ў тэатр, я, каб не казалі, што адрываюся ад калектыву, здаў адказнаму за культмасавы сектар яшчэ рубель з чвэрцю.

На апошнія капейкі я даехаў да заапарку, каб папрасіць кіраўніцтва даць магчымасць «беднаму» студэнту крыху падзарабіць. Дырэктар заапарку прыняў мяне ветліва, нават прыўзняўся з мяккага крэсла, запрашаючы прысесці. Даведаўшыся, у чым справа, развёў рукамі:

— Даглядчыкі нам не патрэбны, карміць звяроў ёсць каму... Вось калі б вы згадзіліся пабыць у тыгравай шкуры?

Нічога не разумеючы, я здзіўлена лыпаў вачыма.

— Разумееце, — даводзіў дырэктар.—у нас памёр стары тыгр. Вось калі б вы залезлі ў яго шкуру ды пацешылі наведвальнікаў парка?! Га?

Што тут рабіць? І я згадзіўся. Апранулі мяне ў тыгравую шкуру, завялі ў клетку і зачынілі дзверы. Хутка збегліся да клеткі малыя, дарослыя, а я паходжваю сабе паволі ды час ад часу грозна рычу:

— Р-р-р-р! Р-р-р-р!

Раптам дзверы ў клетку расчыняюцца і да мяне ўбягае сам леў. «Вось дык госць!» — я адчуў, што сэрца маё трымціць у грудзях, як туга нацягнутая струна. У вачах пацямнела, і я ледзь не пляснуўся долу.

— Пачакай, сябар! — загаварыў леў. — Ты з якога факультэта?

Пасля гэтага выпадку я хварэў амаль месяц. Бывае, падхаплюся ноччу ды як зарычу: «Р-р-р-р!». Аж самому страшна становіцца! Цяпер ужо нічога...

Вось яно як, брат, са стыпендыяй бывае...

З таго часу я і разлічваю ўсё да капеечкі. І ведаеш, нават у кіно застаецца, калі творча падысці да гэтай справы.

Я засмяяўся. Вось, думаю, дзівак! Навошта ён гісторыю з тыграм прыдумаў... А наконт стыпендыі дык гэта як каму — мне хопіць. А там, у канцы месяца, яшчэ і бацькі падкінуць.

Трэцякурснік хітравата падміргнуў на развітанне і заспяшаўся ў аўдыторыю. Рушыў далей і я.

Хвілін праз дзесяць, атрымаўшы «чырвоненькія», я выйшаў на вуліцу, ужо забыўшыся на гэту сустрэчу.

Праз шэсць дзён, калі ў маіх кішэнях адзінока звінелі медзякі, я ўспомніў параду сябра. Позна ўспомніў...

Цяпер пасля лекцый я іду на станцыю. Цягаю скрыні... Чакаю стыпендыі...

**В. ЖУКАЎ,**
**студэнт.**

Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Тыраж 2000

Аб'ём — 1 друк. ар.

Газета выходзіць па чацвяргах.

Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

АТ 20025

Зак. 1260.